Жыве Беларусь!



Народная газета

Орган Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь

№23(536) 2 лютага 1993 г. Аўторак. Выдаецца з кастрычніка 1990 года на беларускай і рускай мовах. Тыраж 607902 экз. Кошт у розніцу — 4 руб.

ФАКС

Будем вхожи во Всемирный банк

Сегодня в Минск прибывает с визитом вице-президент Всемирного банка г-н Уилфред Талвиц.

В программе пятидневного пребывания возглавляемой им делегации — встречи в экономических министерствах и ведомствах, завтрак с белорусскими предпринимателями.

Ожидается, что миссия завершится подписанием документа, определяющего взаимоотношения Всемирного банка и Республики Беларусь.

Игорь ФИЛИПЕНКО.

По чем сохнет рубль?

Вчерашний курс валют банка "Комплекс" в Минске

Наименование валюты	Скупка	Продажа
Доллар США	700	720
Немецкая марка	440	457
Английский фунт	1049	1080
Французский франк	126	130
Финская марка	128	131

Валютный ажиотаж продолжается. С прошлой пятницы доллар в республике подорожал почти на сто рублей. А за последние десять дней — на двести.

Как известно, рост "зеленых" в Беларуси был вызван скачком валютных курсов в Москве. На какой отметке остановится доллар, пока сказать трудно. Но нынешняя ситуация, по мнению экспертов, уже практически не контролируется.

Так, в Минске банк "Беларусь" скупал вчера доллары за 660 рублей, а "Приорбанк" — за 700. В основном сейчас ведется скупка валюты...

Антон ЧЕКОВ.

Несчастный случай действительно произошел...

Уголовное дело майора Дальневосточного военного округа, подозреваемого в подготовке покушения на жизнь президента России Бориса Ельцина, передано в Генеральную прокуратуру России.

Как удалось выяснить корреспондентам ИТАР—ТАСС в Хабаровске, подозреваемый еще 25 декабря минувшего года не вышел на службу, не ночевал дома. Поскольку этот офицер характеризуется как исполнительный и высококвалифицированный специалист, сослуживцы решили, что с ним произошел несчастный случай...

Роман ЗАДУНАЙСКИЙ, Анатолий ВОСТОКОВ.

Едут, едут из столицы

Массовый отъезд московских казаков на Дон наблюдается в эти дни.

Они спешат в Новочеркасск, где будут перезахоронены останки знаменитого казака, героя Отечественной войны 1812 года Матвея Платова. До революции прах атамана донского казачьего войска находился в крупнейшем храме города. Но в 20-е годы большевики вышвырнули его оттуда. Только теперь, в годовщину 175-летия со дня смерти Платова, останки с почестями перенесут на прежнее место.

Дмитрий КОВАЛЬКОВ, РИД.

Спорт-экспресс

В финальной встрече Кубка Содружества футболисты минской "Беларуси" проиграли московскому "Спартаку" — 0:8. Призовой фонд турнира составлял 50 000 долларов, и половину из них получат финалисты.

❑

В первенстве МХЛ хоккеисты минского "Динамо" проиграли в гостях "Крыльям Советов" (Москва) — 2:3.

❑

Минчанка Наталья Зверева в паре с американкой Джиджи Фернандес стала победительницей открытого чемпионата Австралии по теннису.

❑

В минувшие выходные в Париже, во время соревнований рапиристов за "Кубок Фаберже", состоялись торжественные проводы из большого спорта олимпийского чемпиона, пятикратного чемпиона мира Александра Романькова.

❑

Футболисты национальной сборной Беларуси сыграли вничью с командой Перу — 1:1.

("Народная газета" — ИТАР—ТАСС.)

Научите, как стать "волчонком"

Минск посетила делегация Ассоциации скаутов Бельгии во главе с ее вице-президентом Жоэль Раковер.

Во время встреч с руководством Союза скаутов Беларуси обсуждались перспективы вступления ССБ во Всемирную организацию скаутского движения, условия проведения летнего скаутского фестиваля в районе детского лагеря "Зубренок", а также вопросы, связанные с организацией в апреле этого года курсов для руководителей скаутских единиц республики — начальников патрулей, отрядов, дружин, инструкторов "волчат".

Алесь КНЯЗЮК, БелаПАН.

Любовь к "зеленым" признана как чувство

В Азербайджане разрешены любые валютные операции — уголовная ответственность за их проведение не грозит ни физическим, ни юридическим лицам.

Решение об этом принял парламент республики и внес соответствующие изменения в Уголовный кодекс Азербайджана.

Натиг АБДУЛЛАЕВ.

Почти судьбоносные числа

"Спортлото": результаты 5-го тиража (31 января).

"6 из 45": 16, 20, 45, 14, 44, 33.

"5 из 36": 23, 32, 12, 1, 18.

"6 из 56": 10, 4, 2, 15, 42, 44 плюс 34 (льготный).

ИТАР—ТАСС.

Боевики на Пружанщине

Кабельное телевидение появилось в Пружанском районе.

Первым обзавелся модной новинкой колхоз "Советский пограничник". Теперь после напряженного рабочего дня колхозники развлекаются просмотром американских боевиков. Скоро видеопрограммы смогут смотреть еще три соседних хозяйства — колхозы "Путь Ленина", имени Свердлова и совхоз "60 лет БССР".

Елена МИХАЙЛОВА, РИД.

Будем устанавливать культурные отношения

На 4 и 5 февраля намечен визит министра культуры Литвы Д.Тринкунаса в Беларусь.

В его программе — подписание соглашения и программ сотрудничества и обмена между Министерством культуры Республики Беларусь и Министерством культуры и образования Литовской Республики на 1993—1994 годы.

Ирина ФЕДОРОВА.

Есть на что посмотреть

Завтра в Минске во Дворце искусств открывается выставка народного художника Беларуси, профессора, лауреата Государственной премии республики Гавриила Ващенко.

Как известно, недавно Международным биографическим центром в Кембридже ему присуждены почетные звания "Человек года 1992/93", "Человек столетия" и именная серебряная медаль.

Ольга РОГОВА.

Лучше не связываться?

Со вчерашнего дня за простое письмо в ближнее зарубежье требуется заплатить 15 рублей, за заказное — 25 рублей.

Отправка килограммовых бандеролей и посылок теперь обойдется не в 8 рублей, как раньше, а в 204. Абонентская месячная плата за пользование телефоном составит 120 рублей.

Владимир РОМАНОВИЧ, РИД.

Большое видится на расстоянии?

Специалисты экономических институтов Германии, анализируя различные аспекты экономической политики Беларуси, сделали вывод, что простор для развития рыночных отношений в республике пока не обеспечен.

По мнению германских экономистов, основные предпосылки для осуществления крупных программ помощи ныне отсутствуют. Сейчас, считают они, целесообразнее поощрять проекты, предусматривающие оказание медицинской помощи жертвам ядерной катастрофы в Чернобыле и переселение людей из регионов со значительным радиоактивным загрязнением.

Анатолий ВИТКОВСКИЙ, РИД.

Самый "смертельный" город

Первое в СНГ место по количеству самоубийств занимает Севастополь.

В прошлом году число суицидов в городе увеличилось в 2,5 раза. Единственное, что пока смогли сделать севастопольские власти, — установить телефон доверия. Дежурящие врачи-психиатры ежедневно отвечают в среднем на 30 звонков, большинство обратившихся удается отговорить от последнего шага.

Дмитрий КОВАЛЬКОВ, РИД.

Гори ты, колхоз, огнем...

Почти одновременно случилось два пожара в Глубокском районе.

Тридцать коров сгорело в колхозе имени Свердлова "по инициативе" пьяного сторожа, включившего самодельный обогреватель и заснувшего глубоким сном. Большую часть дойного скота — около 180 голов — удалось спасти. Вовремя выскочил с фермы и виновник пожара, которому теперь придется отвечать за свое разгильдяйство.

Едва не лишился такого же стада коров и колхоз "За Родину". Правда, уцелевшим животным теперь грозит бескормица: огонь уничтожил 200 тонн сена, хранившегося рядом с фермой. Следствие предполагает, что поджог учинила колхозница, которая решила таким образом наказать начальство за причиненную ей обиду. Но выводы делать еще рано.

Сергей СЕРГЕЕВ.

Мы і свет

"Нас ніхто не чакае з распасцёртымі абдымкамі"

Параўноўваючы сёлетні Сусветны эканамічны форум у Давосе з мінулагоднім, я адзначаю шмат перамен, заявіў у інтэрв'ю карэспандэнтам ІТАР—ТАСС Старшыня Вярхоўнага Савета Беларусі Станіслаў Шушкевіч.

У Давосе мы наглядна сутыкаемся з вельмі цікавай сітуацыяй, працягваў кіраўнік беларускай дзяржавы. Справа ў тым, што кола інтарэсаў прадстаўнікоў краін СНД прыкладна аднолькавае, і ўсе мы, сустракаючыся, напрыклад, з кіраўнікамі МВФ, Сусветнага банка ці Еўрапейскага банка рэканструкцыі і развіцця, узнімаем адны і тыя ж праблемы.

Зразумела, каб пераканацца ў агульнасці нашых інтарэсаў і праблем, няма патрэбы ехаць у Давос, заўважыў Станіслаў Шушкевіч. Гэтая ісціна вядомая і доказаў не патрабуе. Але тут у час сустрэч і гутарак з нашымі суседзямі, якія не ўваходзяць у СНД, у тым ліку з Усходняй Еўропы, атрымліваеш новае пацвярджэнне другой ісціны: нас ніхто не чакае ў інтэгрыруемай Еўропе з распасцёртымі абдымкамі. Мы можам быць яе партнёрамі толькі там, дзе гэта для яе вельмі выгадна. У нас жа, асабліва ў рамках былога Савецкага Саюза, рэальных перадумоў для ўзаемавыгаднай эканамічнай інтэграцыі намнога больш, і з гэтым нельга не лічыцца. Але пры гэтым, падкрэсліў Старшыня Вярхоўнага Савета Беларусі, трэба добра ўсведамляць, што да старой інтэграцыі з яе зусім вар'яцкім марнаваннем сродкаў і рэсурсаў звароту няма. Трэба шукаць шлях да аднаўлення старых сувязей, але на новай эканамічнай аснове.

На прэс-канферэнцыі, якая адбылася, Станіслаў Шушкевіч пазнаёміў прадстаўнікоў сусветнага друку з тымі праблемамі, якія вырашае цяпер Беларусь. Адказваючы на пытанне аб тым, ці збіраецца рэспубліка пераходзіць на ўласную валюту, ён адзначыў, што галоўнай мэтай з'яўляецца стварэнне эфектыўнай эканомікі. Пры любых абставінах валюта — сродак для дасягнення мэты. Увядзенне ўласнай грашовай адзінкі мае свае плюсы і мінусы, аднак пры нестабільнай эканамічнай абстаноўцы такі крок непажаданы. Падкрэсліўшы імкненне Беларусі застацца ў рублёвай зоне, ён адзначыў, што ў прынцыпе гэта не выключае магчымасці ўвядзення ўласнай валюты.

Журналістаў цікавіў таксама падыход Беларусі да праблемы ядзернага раззбраення. Наша пазіцыя зразумелая, сказаў Станіслаў Шушкевіч. Мы выступаем за бяз'ядзерны статус нашай рэспублікі, але ядзерныя ракеты, якія знаходзяцца на яе тэрыторыі, яна не сама знішчае, як і не сама іх вырабіла. Гэтае сучаснае ўзбраенне належыць Расіі, і на падставе двухбаковых дагавораў яно будзе выводзіцца. Можна паскорыць гэты працэс, але ён упіраецца ў грошы. Таму гэтае пытанне адносіцца да эканамічных, а садзейнічанне ў гэтай справе, сказаў ён, мы атрымліваем амаль што касметычнае. Выказаная ў Давосе прэзідэнтам Украіны прапанова аб стварэнні міжнароднага фонду садзейнічання ядзернаму раззбраенню кіраўнік беларускай дзяржавы назваў цікавым, але патрабуючым падрабязнага вывучэння.

Мікіта ЕРМАКОЎ, Барыс ШАБАЕЎ.

Нельга маўчаць!

Уявіце сабе такую сітуацыю. Прыходзіць да гаспадара на ягоную сялібу незнаёмы чалавек, называе сябе ледзь не братам і земляком і раіць: маўляў, у цябе і хата не так збудавана, і падмурак не такі, і вокны не туды глядзяць. Рабіць трэба так і так.

Прыкладаў такога імпартнага данайства ў апошні час дастаткова і на розныя тэмы. Але найперш многіх аўтараў хвалюе моўнае пытанне. Звароты да Вярхоўнага Савета з'яўляюцца адзін за адным. Настойліва ставіцца пытанне аб наданні рускай мове статусу дзяржаўнай.

Такое калектыўнае пісьмо на прыканцы года атрымала і "Народная газета". А напісалі яго беларусы па паходжанню, акадэмікі Расійскай акадэміі Капцюг, Трафімук, Пармон. Мы меркавалі ў парадку дыскусіі яго выкарыстаць. Але літаральна праз некалькі дзён ім "выстраліла" "Советская Белоруссия". Зразумела, што патрэба ў публікацыі адпала. Але пісьмо закранула і шматлікіх чытачоў "Народнай газеты". Пасыпаліся пісьмы, пайшлі тэлефонныя званкі з просьбамі прадоўжыць дыскусію і публікацыі па гэтаму важнаму для Беларусі пытанню.

Мы выкарыстоўваем такую магчымасць і сёння даём слова Нілу Гілевічу.

Паклапаціліся, падтрымалі... Дзякуем, шаноўныя!..

Ніл ГІЛЕВІЧ,
народны паэт Беларусі, заслужаны дзеяч навукі, прафесар, народны дэпутат Рэспублікі Беларусь

З вялікім засмучэннем прачытаў я адкрыты ліст трох вядомых вучоных, акадэмікаў РАН, "в чьих жилах течет белорусская кровь", якім, паколькі жывуць не ў Беларусі, "легче высказываться на весьма деликатные темы" і якія ўзялі на сябе абавязак папярэдзіць і такім чынам засцерагчы "свою родину от опасной ошибки и от того, что впоследствии будут называть "гримасой истории".

Падумалася: як бы зрэагавалі на падобную моўную сітуацыю вучоныя, акадэмікі, ну, скажам, балгарскія ці славенскія, якія воляю лёсу вымушаны жыць далёка ад Бацькаўшчыны, — што напісалі б яны Вярхоўнаму Савету сваёй дзяржавы? А напісалі б яны прама процілеглае таму, што напісалі нашы землякі. Яны — тыя балгары або славенцы (або з любой іншай "крывёю ў жылах") — падтрымалі б перш за ўсё адраджэнне роднай мовы і культуры на сваёй радзіме, горача прывіталі б Закон, які зрабіў іх родную мову дзяржаўнай, і далі б дэпутатам парламента наказ: ні ў якім разе не надавайце гэткі ж статус яшчэ адной мове, бо ў сённяшняй сітуацыі гэта будзе падпісаннем смяротнага прыгавору самім сабе, будучыні свайго народа, сваёй нацыі. Ну, ды гэта — калі б балгары або славенцы... А калі беларусы, з беларускай "крывёй у жылах"... Ах ты, наша распрагоркая, наша выклятая Богам доля! Знайшлі што сказаць свайму народу — у лёсавызначальны момант ягонай гісторыі — яго знакамітыя вучоныя сыны! Хаця ж вы, дарагія, але някемлівыя і тупаватыя землякі, не зрабіце страшнай памылкі — не зрабіце сваю родную, тутэйшую, неачэсаную мову мовай дакладных навук і тэхнікі **"и соответствующих предметов в средней и высшей школе"** (падкрэслена мною. — Н.Г.). Выганяючы скаціну ў поле або кормячы яе на ферме, можаце, калі ласка, карыстацца і беларускай мовай, для гэтага яна прыдатная. Можаце на ёй і казачкі расказваць або "сцішкі" складаць. Але каб у навуку і тэхніку з ёю сунуцца?.. Ды вы што — ачмурэлі? "С мякинным рылом да в калашный ряд?" Апомніцеся!.. Зрэшты, відаць, я паспяшаўся і наконт фермы, бо сёння і на ферме тэхніка, і там працуюць людзі, якія вывучалі дакладныя навукі. У сапраўднасці так яно ў нас і ёсць: і на ферме і на полі вучоныя спецыялісты (заатэхнікі, аграномы) карыстаюцца рускай мовай — тою, якой іх навучылі прафесары і акадэмікі; ну, а гледзячы на іх, і даяркі са свінаркамі стараюцца патрапляць "па-культурнаму"... Так яно і круціцца. Калісьці так круцілася пры царах і панах, потым — гадоў семдзесят — пры генсеках і членах палітбюро, цяпер — пры нібыта дэмакратах і прадпрымальніках... Вось ужо дзе сапраўды паводле прымаўкі: як не ўпяклося, дык і не ўварылася!.. Мяняюцца цары, распадаюцца імперыі, утвараюцца незалежныя дзяржавы, здадзены ў музей не толькі сохі, але і першыя касмічныя спадарожнікі, а нашай мове — мове 10-мільённага беларускага народа — адукаваныя і адукаванейшыя людзі па-ранейшаму прадпісваюць адну і тую ж місію, адно і тое ж права. Як у тым даўнім, напісаным гадоў трыццаць назад вершы:

Прарочылі лёс ёй — ажно да скanання
Хадзіць за хвастамі быдлячымі з пугай,
Быць моваю дворнікаў, прачак ды нянек,
І то — не абчэшацца покуль прыслуга...

І да чаго ж жывучая шляхетная рыса нашых навукоўцаў, многія з якіх, дарэчы, канчалі вясковую школку на роднай беларускай мове, што аніяк не перашкодзіла ім выйсці ў вялікія людзі.

Шаноўных акадэмікаў апанавала трывога: хаця б "переход на белорусский язык" не абярнуўся ў будучым грымасай гісторыі. Дык больш пачварнай і страшнай грымасы, паважаныя аўтары пісьма, чым тая, якую стварыла на добрым абліччы і даверлівай душы нашага народа імперская нацыянальная палітыка, і ўявіць немагчыма! Тое, што зрабілі на нашай роднай зямлі з нашай роднай мовай, культурай, гісторыяй, — гэта над усімі грымасамі грымаса. Час дае нам, нашаму з вамі народу, магчымасць пазбыцца — назаўсёды пазбыцца! — гэтага звыроднага пачварнага з'явішча. Дапамажыце яму, шаноўныя, у гэтым! Падтрымайце яго намаганні распрастаць прыгнечаную душу, развінуць падкурчаныя крылы! А будзеце ў яго памяці жыць вечна!

І не трэба, не трэба наганяць на людзей панічныя страхі-жахі за лёс рускай мовы на Беларусі! Нічога ёй у нас не пагражае. У Законе аб мовах напісана па-навуковаму дакладна: "Ва ўсіх агульнаадукацыйных школах Рэспублікі Беларусь **вывучэнне беларускай і рускай моў з'яўляецца абавязковым**" (арт.24). І яшчэ: "Тэхнічная і праектная дакументацыя ў Рэспубліцы Беларусь рыхтуецца **на беларускай або рускай мове, а з улікам прызначэння — на іншай мове**" (арт.10). Дык адкуль і з-за чаго трывога? Пра якое "самозамыкание специалистов" гаворка? Хто гэтага самазамыкання патрабуе? Па нашых законах і аб мовах і аб адукацыі грамадзяне Беларусі будуць у дастатковай меры валодаць рускай мовай і навукоўцы, калі трэба, будуць пасылаць свае працы ў шырокі свет на рускай мове. Было б што пасылаць! Дзяржаўны статус беларускай мовы і яе добрае веданне ўсімі грамадзянамі рэспублікі перашкодаю тут не будзе. Як няма такой перашкоды для навукоўцаў балгарскіх, венгерскіх, польскіх і іншых, якія таксама творча "связаны с мировой наукой", але ў інстытутах і канструктарскіх бюро карыстаюцца роднай мовай і свае працы — калі не вымагаецца іншай — пішуць на роднай мове. А галоўнае — ім і ў галаву не прыходзіць заклікаць землякоў развіваць адукацыю і навуку ў сваёй дзяржаве на мове іншага народа, роднай жа мове адводзіць месца на задворках інтэлектуальнага і наогул духоўнага жыцця.

Увесь корань бяды нашай у тым, што многія з нас усё яшчэ пачуваюцца "тутэйшымі", а не грамадзянамі незалежнай еўрапейскай дзяржавы Беларусь, усё яшчэ працягваюць глядзець у рот дужэйшаму суседу, усё яшчэ не навучыліся паважаць самі сябе, не набылі ў належнай меры пачуцця нацыянальнай годнасці. Калі навучымся, калі набудзем — усякія такія "далікатныя" моўныя праблемы адпадуць самі па сабе. Тое, што ў цывілізаваным свеце з'яўляецца натуральнай жыццёвай нормай, — будзе гэткаю нормай і ў нас.

Ну, а пакуль што — дзякуем, шаноўныя, што паклапаціліся, падтрымалі землякоў на гэтым шляху да агульначалавечай нормы.

...Ало, вас слухае "Народная газета"

Адзіная вайна, якую можа падтрымаць народ, — гэта вайна са злачыннасцю

Андрэй ЮДЧЫЦ

Не буду называць прозвішчаў ніводнага з шасцідзесяці тэлефанаваўшых мне ў мінулую пятніцу чытачоў "Народнай газеты". Яны пазнаюць сябе за нейкім радком, за нейкім словам гэтых нататак.

Пра многае гаварылі нашы чытачы па "тэлефоне шчырасці". Вельмі часта — аб цяжкім становішчы, у якім апынуліся сёння пенсіянеры, аб іх бясконцых турботах. Аднак тэмай N 1, трывогай N 1 стала злачыннасць, яе вытанчаныя формы — карупцыя, мафія.

Калісьці Хрушчоў абяцаў: прыкладна ў 1980 годзе мы пакажам па тэлевізару апошняга злачынцу. Як ён жорстка памыляўся, шаноўны і шчыры ў сваіх прагнозах Мікіта Сяргеевіч!

Злачынца сёння — не кіношны неахайны граміла. Традыцыйныя "зладзеі ў законе" яўна ўступаюць "зладзеям у бізнесе". Гэтыя — сучасныя — добра апранутыя людзі, якія ўмеюць гаварыць, маюць доступ у чыноўніцкія кабінеты. Самі не забіваюць — куды зручней забойца-найміт.

Прававы "беспредел" адбываецца на вачах у народа.

Крадуць мільёнамі, а караюцца толькі штрафамі ў некалькі тысяч рублёў. І выходзяць з суда з усмешкай.

Мы думалі, што рухаемся да рынку вытворцаў. А трапілі на рынак спекулянтаў-перакупшчыкаў.

Ёсць факты дзікага самаўпраўства кіраўнікоў на месцах. І паспрабуй ім што сказаць супраць. Іх ніхто не кантралюе. Нават рашэнне суда, у тым ліку і Вярхоўнага, для некаторых з іх — пусты гук. У асобных чыноўнікаў, падобна на тое, у галаве памутнела ад бескантрольнага, нікім не спыняемага самавольства.

Барацьба за цвярозасць, якую ўсе добра памятаюць, была даведзена да абсурду, да камізму. Але гэта была як бы спроба спыніцца, азірнуцца, адумацца. Цяпер жа зноў пайшло злачыннае, інакш не скажаш, спойванне людзей. На кожным кроку — віно, спірт, гарэлка.

Адзін чытач расказаў выпадак, які яго вельмі ўразіў: два міліцыянеры прывялі ў райваенкамат прызыўніка ў наручніках — на службу ў армію. Не будзем разважаць пра гэта, не ведаючы канкрэтных абставін. Але сам факт!..

Жанчына ніяк не можа "выбіць" тое, што "паложана" ёй. Звярнулася па дапамогу да прадстаўніка ўлады, а той параіў: "Найміце рэкеціра".

Адно слова: "беспредел".

Цярплівы народ беларусы. Але ад адчаю, недаверу да ўлады з'яўляюцца зусім не характэрныя для нас настроі. Законапаслухмяная пенсіянерка, якая ніколі ў жыцці не перайшла вуліцу на чырвонае святло, раптам заяўляе: "Была б зброя, узяла б яе ў рукі — такая навокал пануе несправядлівасць, беззаконнасць". Жанчына з бездакорнай працоўнай біяграфіяй гаворыць: "Калі нашага начальніка, які дазваляе сабе шмат чаго беззаконнага, улада не паставіць на месца, я асабіста заб'ю яго і пайду ў турму".

Хто можа сказаць, калі ўпадзе тая апошняя кропля, якая звычайна перапаўняе чашу цярплівасці?

Усе — за барацьбу са злачыннасцю.

Усе!

А злачыннасць расце з году ў год.

Злачынцы тлусцеюць, робяцца больш нахабнымі.

Іншы раз складваецца такое ўражанне, што ўжо злачынцы распараджаюцца лёсамі незлачынцаў.

Адусюль толькі і чуваць: карупцыя, карупцыя. А пакажыце нам злачынцаў на лаве падсудных, гэтых карумпіраваных чыноўнікаў, нахрапістых хабарнікаў, казнакрадаў. Штосьці не бачна.

Нам іншы раз гавораць: няма законаў супраць мафіі, супраць карупцыі.

Для работніцы мясакамбіната, якая дзесьці пад адзеннем выносіць некалькі сасісак, і выносіць толькі таму, што не можа купіць іх у магазіне, — закон ёсць.

А супраць тых, хто крадзе на мільёны, — законаў няма?

Дзіўная справа: няпісаныя законы злачыннага свету выконваюцца, і яшчэ як, а законы пісаныя, няхай і недасканалыя, амаль не дзейнічаюць. Што, у нас у Крымінальным кодэксе ўжо няма артыкулаў аб крадзяжах, злоўжываннях, хабарніцтве, службовым падлогу? Ніхто іх адтуль не выкрэсліваў.

Сапраўды, узнікае мноства пытанняў і да народных дэпутатаў усіх рангаў, перш за ўсё — дэпутатаў Вярхоўнага Савета Беларусі.

Дзе забуксаваў закон аб барацьбе з карупцыяй?

Куды дзеўся закон аб дзяржаўнай службе?

Чаму, нарэшце, сам Вярхоўны Савет увесь час працуе "на грані кворуму"? "Дзе яны там бегаюць? — пытаюць людзі. — Гэта такая там дысцыпліна, арганізаванасць, павага да парадку?"

Прыкрываючыся дэпутацкімі мандатамі, нярэдка ўхіляюцца ад адказнасці дэпутаты—парушальнікі законаў. Яны, бачыце, недакранальныя.

І гэта тыя самыя дэпутаты, якія перад выбраннем кляліся нам у прыхільнасці прававой дзяржаве, гаварылі пра роўнасць усіх перад законам, абяцалі змагацца з прывілеямі, злачыннасцю. Як нядаўна ўсё гэта было!..

Нам пастаянна гавораць: абстаноўка знаходзіцца пад кантролем. Хацелася б верыць, што гэта сапраўды так. Сёння, бадай, так і ёсць. Але людзі ўжо выразна бачаць: злачыннасць сёння — рэальная сіла, здольная ў любы момант дэстабілізаваць грамадскі парадак.

І калі злачыннасць возьме верх, то позна і бессэнсоўна будзе разважаць пра нейкія там дзяржаўнасць, незалежнасць, эканамічныя рэформы.

Народная газета

Постановление Совета Министров Республики Беларусь

Об обеспечении жильем инвалидов и участников Великой Отечественной войны, семей погибших или пропавших без вести воинов (партизан) и приравненных к ним в установленном порядке лиц

Совет Министров Республики Беларусь постановляет:

1. Исполкомам местных Советов народных депутатов, министерствам, ведомствам, предприятиям, учреждениям, организациям обеспечить выделение в установленном порядке жилой площади в 1993 году инвалидам Великой Отечественной войны и в 1993—1995 годах участникам Великой Отечественной войны, семьям погибших или пропавших без вести воинов (партизан) и приравненных к ним в установленном порядке лицам, состоящим на учете, нуждающимся в улучшении жилищных условий на 1 января 1993 г.

Министерству финансов изыскать в текущем году за счет средств республиканского бюджета 4,7 млрд. рублей на финансирование строительства жилья для указанных категорий граждан.

2. Облисполкомам и Минскому горисполкому предусматривать строительство в городах с большим количеством инвалидов, нуждающихся в улучшении жилищных условий, специальных домов с комплексным обустройством и набором комнат в квартирах соответственно числу членов семей.

3. Облисполкомам и Минскому горисполкому в июле 1993 г. доложить Совету Министров Республики Беларусь о ходе выполнения настоящего постановления и аналогичную информацию представлять ему ежегодно в январе 1994—1996 годов.

Председатель Совета Министров Республики Беларусь В.КЕБИЧ.

Управляющий делами Совета Министров Республики Беларусь Н.КАВКО.

28 января 1993 г.
г.Минск.

Репортер узнал

Пора котельным "на гражданку"!

Организовано бороться за нормальный быт решили жители военного городка Боровуха-1 Полоцкого района.

В общественную организацию "Быт и экология" вошло более 500 человек — представителей офицерских семей, возмущенных безразличием оборонного ведомства к условиям их жизни. При рекордном числе котельных — 20 штук на 7 тыс. человек — Боровуха даже в теплую зиму замерзает. Жилье требует капитального ремонта, люди измучены перебоями с водой и газом. Активисты "Быта и экологии" во главе с майором запаса Владимиром Ткачуком требуют передачи коммунального обслуживания военного городка "на гражданку" — в ведение Полоцкого райисполкома.

Сергей ДВИНСКИЙ.

Город поет. Значит — живет

Сельскими гастролями отметила свое 25-летие первая в Витебской области детская филармония-школа искусств г.Новолукомля.

Родившееся почти одновременно со "столицей" белорусской энергетики, это учебное заведение объединило обычную "музыкалку" с классами хореографии, живописи, скульптуры.

Более 500 юных жителей растущего города и окрестных деревень получили здесь "путевку" в мир высокого творчества, и очень многие, действительно, стали профессионалами.

К юбилею в школе искусств открыт музей старинного белорусского быта. Образцы традиционных народных ремесел учащиеся отыскали в "глубинке" Чашникского района.

Степан СТАРОЖИЛ.

Выезжающих станет больше?

В конце января в Минске состоялась встреча руководителей крупнейших туристических организаций республики с представителями брестского "Погрансервиса" — фирмы, обслуживающей туристов при прохождении границы на ОКПП "Варшавский мост". Руководство "Погрансервиса" приняло решение о повышении платы за обслуживание при прохождении границы одного автобуса до 10 тысяч рублей. Однако оно, по мнению руководителей турфирм, нуждалось в более глубокой мотивировке. В результате конструктивного диалога было принято общее решение — согласиться на увеличение стоимости, но при условии прохождения границы туристским автобусом в течение 12 часов. В случае нарушения этого срока оплата остается прежней.

Кроме того, по сведениям "ТУР-Пресса", суточная квота увеличивается до 45 автобусов. Как сообщил нам директор "Погрансервиса" Виктор Замировский, суточный поток автобусов будет разбит на две части: первая должна прибывать к 12.00, вторая — к 24.00. По его мнению, нынешнее решение правительства вполне выполнимо, так как подкреплено согласованными действиями с белорусской таможней и пограничной службой.

"ТУР-Пресс".

Здраўніца на дваіх

База адпачынку "Сулор'е" гродзенскага вытворчага аб'яднання "Хвала" не прадаецца з маёмасцю, хоць у гаспадаркі мала сродкаў на ўтрыманне індустрыі адпачынку, якая стала вельмі дарагой. Палавіну месц аддаў у арэнду Міністэрству аховы здароўя рэспублікі. Яно атрымала магчымасць размясціць на беразе маляўнічага горада спецыялізаваны санаторый для маці і дзіцяці, а прадпрыемства — значна скараціць за кошт гэтага свае расходы.

Дэфіцыт на дарозе

Літаральна пад нагамі, на калгасных звалках, знайшлі дэфіцыт работнікі Клічаўскай райаграпрамтэхнікі. Яны ўзяліся аднаўляць старыя акумулятарныя батарэі для трактароў, грузавых і легкавых аўтамашын. Такі рамонт каштуе танней, чым купля ў Расіі або на Украіне. Ужо ў гэтым годзе клічаўскія рамонтнікі разлічваюць забяспечыць патрэбнасці вобласці ў акумулятарах да трактароў "Беларусь" і асобных марак аўтамашын. У кампаньёны рамонтнікі запрасілі вучоных Беларускага інстытута тэхналогіі металаў Акадэміі навук рэспублікі, якія вырабілі ў сваіх лабараторыях частку аснасткі і распрацавалі арыгінальную тэхналогію.

Трымайся, экопа!

Для нас гэта — сенсацыя, для цывілізаванага свету — заканамернасць. Гомельскія экалагі прыпынілі работы на левым беразе ракі Сож. Тут, у раёне вёскі Якубаўка, пачаўся суцэльны намыў грунтоў для ўзвядзення новага, семдзесят сёмага мікрараёна абласнога цэнтра. Па вопыту мінулых гадоў праект узгаднілі ва ўсіх інстанцыях, акрамя экалагічнай. Цяпер, пасля кардынальнага рашэння спецыялістаў, такую экспертызу ўсё ж прыйдзецца правесці. У выніку падобнага вынікам работы пакуль "замарожаны".

Белінфарм.

Спакой нам толькі сніцца...

Збег недарэчных і заканамерных абставін вельмі паспрыяў нядаўняму начному крадзяжу ў цэнтральным гастраноме пасёлка Ушачы.

У тую ноч з-за аварыі надвор'я ў цэнтры гарпасёлка не гарэла святло, слабенька мільгацела лямпачка ў самім магазіне і ўсё ж не спрацавала састарэлая сігналізацыя, калі зладзеі разбілі шкло вітрыны.

За садзейнічанне ў раскрыцці крадзяжу на 63 тысячы рублёў аб'яўлена ўзнагарода. Міліцыя, раённае аддзяленне якой, дарэчы, размешчана ў трохстах метрах ад гастранома, — у пошуку.

Вольга КАРАЛЕНКА.

Здоровье не купишь. Печение продается

Одним из первых в Витебской области начало приобретать медицинские страховые полисы для своих работников СП "Белвест".

Его примеру последовали другие предприятия, колхозы и совхозы, а также отдельные предусмотрительные и, конечно, не самые бедные граждане. Те, кто нуждается во врачебной помощи, могут обратиться в медучреждения, которые заключили договор со страховыми компаниями. Например, витебскую городскую больницу N 3, где для обладателей полисов подготовлено суперсовременное оборудование, подготовлены комфортабельные палаты, обустроены даже индивидуальные родильные помещения.

Сергей ВИТЕБСКИЙ.

Грып наступае

Як паведамілі карэспандэнту Белінфарма ў Міністэрстве аховы здароўя, у рэспубліцы пагаршаецца эпідэмічнае становішча па грыпу і вострых рэспіраторных захворваннях.

Напрыклад, у Мінску з сярэдзіны студзеня кожны дзень хварэе ўжо 26—27 тысяч чалавек, і распараджэннем галоўнага санітарнага ўрача горада ў сталіцы пачалі праводзіць процiэпідэмічныя мерапрыемствы. Павышаны ўзровень захворвання быў зарэгістраваны ў апошнія дні ў Брэсце, Віцебску, Магілёве, Баранавічах і Барысаве. Каменціруючы сітуацыю, галоўны эпідэміёлаг Міністэрства аховы здароўя Анатоль Кажамякін паведаміў, што вызначаны 18 кантрольных гарадоў, у якіх вядзецца дакладнае назіранне за развіццём падзей. Паводле паведамлення санкт-пецярбургскага рэгіянальнага цэнтра грыпу, у большасці гарадоў СНД сітуацыя пакуль што толькі пагражальная, але чакаецца эпідэмія грыпу Б. Дарэчы, эпідэмічны ўзровень захворвання ўжо зарэгістраваны ў Мурманску, Калінінградзе, Карагандзе, Уфе, Ташкенце. Аб эпідэміях у "далёкім" замежжы, удакладніў Анатоль Кузьміч, пакуль што не паведамляецца. Але вядома, што вірус грыпаў А і Б выяўлены ўжо ў хворых у ЗША, Чэхаславакіі, Партугаліі, Францыі, Румыніі, Галандыі і Швецыі.

Нечаканая развязка

Калі з калгаса "Жалудоцкі" ў Шчучынскі аддзел унутраных спраў паступіў сігнал аб крадзяжы дэфіцытных дэталей да трактароў, аператыўнікі, як звычайна, распрацавалі некалькі версій.

Самай праўдзівай паказалася такая: крадзеж учынены дзеля асабістай нажывы, бо кошт выкрадзенага — 8 тысяч рублёў. Аднак на самай справе атрымалася іншае. Выкрадзеныя запчасткі былі выяўлены на ... трактарах, якія належалі суседняму калгасу "Нёман". Аказваецца, страціўшы надзею на набыццё запчастак па фондах, мясцовыя механізатары, імкнучыся хутчэй адрамантаваць тэхніку да веснавой гарачай пары, "умыкнулі" іх у запаслівых суседзяў.

К.БАЛАТЭВІЧ,
Белінфарм.

Разоблачения

Собачья шуба для бедствующей армии

Иван ГЕРАСЮК, обозреватель по вопросам морали и права, народный депутат Беларуси

В 1989 году, когда стало очевидным, что советским войскам придется оставить Польшу, товародвижение по армейским каналам наводило на совсем другие мысли. Похоже, наши офицеры намеревались обустраиваться там основательно.

С марта по декабрь военный магазин "Стройматериалы", расположенный на окраине Минска, отправил в Польшу более 7 тысяч квадратных метров облицовочной плитки (почти 90 процентов предназначенной для продажи в своем округе). То ли у офицеров в Уручье эта плитка "под мрамор" не пользовалась спросом, то ли была острая необходимость оставить будущим хозяевам военные городки в лучшем виде, но товар ушел за рубеж, несмотря на всю коммерческую несостоятельность такой операции.

В конце того же года туда же военные торгспецы переправили более 400 рулонов оцинкованной сетки. Может быть, собственные дачные кооперативы уже не нуждались в такой ограде, может быть, надо было на годы обнести оставляемые объекты нержавеющей сеткой, но лично у меня на этот счет есть иные соображения.

По налаженному конвейеру плывут в СНГ автомобили иномарок, и вряд ли для этого достаточно только офицерских зарплат. В зарубежной прессе немало писалось, как распродаются бензин, материалы, амуниция и даже оружие. Плитка — мелочь. Но, как мне кажется, мелочь, имеющая отношение к последующим событиям.

В феврале 1992 года из торгово-бытового предприятия N 2995 управления торговли Северной группы войск (Польша) в Беларусь поступило непродовольственных товаров и винно-водочных изделий на 1 миллиард 873 миллиона 563 тысячи злотых. К тому времени в кресле начальника управления торговли БВО уже сидел подполковник В.Привалов, прежде служивший в Польше. Кстати, еще тогда многие офицеры-белорусы стремились вернуться на родину, но вакансий для них не находилось. Привалов же, как следует из официальных бумаг, "назначен на должность начальника тыла МО СНГ в тот период, когда Белорусский военный округ входил в Объединенные Вооруженные Силы СНГ".

Вскоре из Польши в Беларусь прибыл и майор А.Жиряков "в соответствии с приказом председателя комитета ТБО ОВС СНГ N 7 от 8.06.92 г." и принял должность начальника отделения торговли, занимаемую ранее гражданским специалистом. Кстати, в тот момент мы имели уже собственное Министерство обороны. Майор Жиряков призывался на службу из Калининграда, не был гражданином Беларуси. Но служил в Польше.

Не знаю, может быть, торговая отрасль считалась стратегической и кадровую политику здесь определяло командование ОВС СНГ, а среди белорусских специалистов не нашлось достойных. Бывает. Однако вернемся к нашим товарам.

Расчет за них производился по методу, который используют все наши вояжеры за Буг, подсчитывая выгоду. Цена в злотых переводилась в доллары, а доллары — в рубли. С той лишь разницей, что один доллар приравнивался к 50 рублям. После этого, как указывается в еще одном официальном документе, "с целью занижения цен на импортные товары торговая надбавка снималась с цены закупа, причем в отдельных случаях цена закупа уменьшалась на 70 и более процентов (при действующей в то время надбавке 33 процента)". В итоге "цены на отечественные товары оказались в 2—3 раза выше, чем следовало, а цены на импортные товары в 2—3 раза ниже по отношению к действующим в то время".

Как вы, вероятно, догадываетесь, этих самых импортных товаров было не шибко много. Зато какие, почем и для кого? К примеру, японский холодильник оказался почти в три раза дешевле, чем "Минск-126". Комиссия определила свободную отпускную цену микроволновой печи "Шарп" в 4.600 рублей, видеоплейера "Тошиба" — в 6.100, кожаной куртки — в 3.000, пальто женского из меха собаки — также в 3.000 рублей и т.д.

Хотя всех товаров было около 1.000 наименований, начальник управления торговли Министерства обороны В.Привалов решил согласовать наиболее волнующие позиции (меха, техника) с Департаментом цен Госэкономплана. Данное согласование удостоверил своей подписью начальник отдела этого департамента В.Филиппов. Единственный вывод, который я могу сделать из этого, — упомянутый начальник давненько не видел прилавков с мехами и видеотехникой хотя бы в наших универмагах. Может, были какие-либо иные соображения. Трудно сказать.

Прежде чем проследить за дальнейшим ходом событий, хотелось бы поразмышлять вот о чем. За время парламентских дискуссий я достаточно наслышан о том, с каким рвением нынешнее руководство военной торговлей республики заботится о нуждах военнослужащих, которые оказались сегодня действительно в бедственном положении. Неужто нынче в военных городках Беларуси была такая острая нужда в "Шарпах", "Панасониках" и собачьих шубах? Если уж случилась такая оказия, неужели не было возможности обменять их на более насущный товар?

Ответ на эти вопросы, на мой взгляд, кроется в заключительной стадии — процессе продажи. Процесс до боли знакомый. Так, в магазин N 31 военторга N 650 г. Пружаны привезли лишь наличные деньги и так называемую бестоварную накладную. Видеомагнитофон "Тошиба", телевизор "Панасоник", видеокамера "Саньо", японский морозильник (8.040 рублей) нашли своих хозяев еще на базе военторга. На 99 процентов уверен, что ни лейтенанты, ни даже майоры боевых частей в эти торговые закрома не вхожи.

По особым распоряжениям продавались в столичном универмаге "Звезда" видеотехника, магнитофоны, шубы из меха нутрии (14.440 рублей) и собаки. Не сомневаюсь, что они не укрыли плечи жен младшего офицерского состава.

Как всегда, риторический вопрос: чьи же плечи они укрыли? Кто их купил — фамилия, должность, звание? Уверяю вас, что даже ЦРУ вряд ли сумело бы вырвать эту величайшую военную тайну из уст как призвездных, так и гражданских лиц, обитающих в этой системе. Начальник отдела торговой инспекции по Минской области Г.Лукашевич пояснил:

— Все распоряжения уничтожены.

Что, впрочем, не ново. Хотя некоторые предусмотрительные торговые работники на всякий случай где-то хранят разного рода записочки. Авось, пригодятся.

В деятельности управления торговли под началом подполковника Привалова были и иные любопытные моменты, которые пыталась прояснить Временная комиссия Верховного Совета по привилегиям. Мы направили в военные инстанции около десятка соответствующих запросов. Наиболее оперативным ответом был такой:

"По поручению министра обороны Республики Беларусь генерал-полковника Козловского П.П. сообщаю, что в Верховном Совете РБ Временной комиссии по привилегиям нет.

С уважением

Вр.ио начальника секретариата министра обороны РБ полковник Н.Турбан".

Но несколько позже в Министерстве обороны все же убедились, что Временная комиссия по привилегиям в Верховном Совете пока еще есть. Ибо только после нашего запроса подполковник Привалов уплатил за машину, которую гоняли в Алма-Ату за несколькими символическими тоннами лука (с коммерческой точки зрения, абсурдный рейс) и вещами начальника управления торговли. Свои вещи подполковник Привалов хранил на торговой базе, оплачивая аренду склада из расчета 3 рубля за квадратный метр в день. Как следует из справки начальника планового отдела базы, сумма должна была быть вдвое большей. Да и деньги были уплачены лишь 10 сентября, хотя договор аренды действовал с 1 июля 1992 года. Не знаю, кто еще из военнослужащих может воспользоваться таким статусом "наибольшего благоприятствования".

Вместе с сотрудником Минского РОВД один весьма подозрительный складик мы опечатали на торговой базе в д. Сухорукие. Работникам базы неизвестно, что там хранится, неизвестно, есть ли договор аренды, но известно, что загрузкой его руководил лично Привалов. Потому и ключей от складика на базе нет. Ну а если случится пожар, придется дверь взламывать. Чем закончится выяснение этого вопроса, не так уж важно. Важнее подумать о другом.

На нынешнюю сессию Верховного Совета я вносил проект постановления "О реорганизации военной торговли". В повестку дня его не включили. Я согласился с мнением парламентской комиссии, что этот вопрос вполне может быть решен в пределах компетенции исполнительной власти. Проект отправили для рассмотрения в Совет Министров. До сих пор, как говорят, ни ответа, ни привета. А жизнь в системе военной торговли бьет ключом все сильнее.

Торговля — исконно гражданское дело. По-моему мнению, государственная торговля должна быть в одних руках, поскольку и фонды, и товары черпаются из одного источника. Есть настоятельная необходимость перевести управление торговли Министерства обороны в непосредственное подчинение Министерства торговли Республики Беларусь, как подобное сделано уже в системе прокуратуры. Совсем не обязательно заниматься торговлей людям с большими звездами на погонах, должностями и окладами. Полагаю, их с успехом смогут заменить гражданские специалисты. А для обеспечения боеспособности существует служба тыла. Кесарю — кесарево. О целесообразности военных универмагов, вроде "Звезды" у Комаровского рынка, я уже писал ранее.

Думаю, от решения этого вопроса нам никуда не уйти. Наверняка придется к нему обратиться на очередной сессии Верховного Совета. Уверен, к тому времени оснований для этого станет еще больше.

Праблема? Праблема!

У Мінску трактары, а ў Кіеве дзядзька

Міхась ЖЫЛІНСКІ
Фота аўтара



Зараз кожнае прадпрыемства хапаецца за саломінку і спрабуе ў адзіночку даплысці да нейкага больш трывалага берага. Напрыклад, Мінскі трактарны завод, каб хоць нейкую капейчыну зберагчы, прымушае пакупнікоў забіраць трактары самавывазам.

